**Рэцэнзія**
**на дапаможнік А. В. Солахава**
***«Словаўтварэнне»***




У сістэме моўнай адукацыі надзвычай важным з'яўляецца пытанне словаўтварэння, паколькі глыбокае асэнсаванне законаў развіцця мовы на розных узроўнях без разумення дэрывацыйных працэсаў уяўляецца малаверагодным. Неабходна вучыць студэнтаў адчуваць унутраны змест слова, вызначаць матываванасць вытворных лексічных адзінак, сродкі словаўтварэння. На жаль, у існуючых вучэбных дапаможніках можна знайсці адказ не на ўсе пытанні словаўтварэння, прадугледжаныя праграмай, у чым найбольш востра адчуваюць патрэбу студэнты і пачынаючыя выкладчыкі.

З улікам адзначанага вышэй дапаможнік А. В. Солахава «Словаўтварэнне» з'яўляецца своечасовым і неабходным выданнем. Тэарэтычны матэрыял у ім падаецца ў адпаведнасці з існуючай вучэбнай праграмай, дакладна акрэсліваецца прадмет і фармулююцца задачы словаўтварэння як раздзела мовазнаўства, у даступнай форме, паслядоўна і аргументавана паказваецца сувязь словаўтварэння як асобнай галіны лінгвістычнай навукі з такімі падсістэмамі мовазнаўства, як фанетыка, лексікалогія, марфалогія, сінтаксіс.

Дапаможнік мае стройную, прадуманую будову. Ён складаецца з адзінаццаці параграфаў, у якіх у лагічнай паслядоўнасці разглядаюцца пытанні, пачынаючы з сутнасці словаўтварэння і заканчваючы спосабамі ўтварэння самастойных часцін мовы. Апошні параграф змяшчае тэарэтычны матэрыял пра словаўтваральныя слоўнікі – алфавітныя і гнездавыя.

Кожны параграф суправаджаецца змястоўнымі, цікавымі практыкаваннямі, якія будуць спрыяць свядомаму, удумліваму і трываламу засваенню тэарэтычнага матэрыялу па словаўтварэнні, развіваць здольнасці студэнтаў лагічна разважаць, супастаўляць дэрывацыйныя факты, беспамылкова вызначаць семантычны аб'ём слоў.

У параграфе «Словаўтварэнне як раздзел мовазнаўства» даволі падрабязна акрэсліваецца прадмет і задачы словаўтварэння, на канкрэтных прыкладах прасочваецца сувязь словаўтварэння з іншымі раздзеламі мовазнаўства. Напрыклад, адзначаецца, што працэс утварэння новых слоў можа суправаджацца такімі фанетычнымі з'явамі, як змяненне месца націску *(але́нь – аленяня)*, чаргаваннем гукаў *(воўк – ваўчаня)*, сцяжэннем гукаў *(г + с – с: многа + -ств (а) – мноства)*.

Параграф «Словаўтваральныя адносіны» прысвячаецца аналізу і тлумачэнню такіх паняццяў, як *утворанае* і *ўтваральнае (зыходнае) слова*, *утваральная аснова, матываванасць*. Засваенне гэтага параграфа дапаможа студэнтам і ўсім, каго цікавяць словаўтваральныя працэсы, што адбываліся і адбываюцца ў беларускай мове, правільна сарыентавацца ў размежаванні ўтваральнага і ўтворанага слоў, улічваючы не толькі іх марфемную структуру, але і семантычны аб'ём. Практыкаванні да названага параграфа дапамогуць дакладна вызначыць семантыку матываваных слоў па аналогіі з пададзенымі ў якасці ўзору; вызначыць словы, якім уласціва множнасць матываванасці. Напрыклад, прапануецца ўказаць матываванасць слоў па аналогіі: 1. *Бярэзнік* – лес, у якім расце бяроза; *хвойнік* – … 2. *Выключальнік* – прадмет, прызначаны выключаць што-небудзь; *знішчальнік* – … і інш. (с. 13).

У параграфе «Асноўныя спосабы словаўтварэння» аналізуюцца спосабы ўтварэння новых слоў у шырокім і вузкім сэнсах. Марфалагічныя і марфолага-сінтаксічныя спосабы словаўтварэння падрабязна і даходліва прадстаўлены ў табліцы, дзе акрэслены механізм словаўтварэння, прыведзены яркі ілюстрацыйны матэрыял.

МГПУ им. И.П.Шамякина

У дапаможніку ўпершыню падрабязна разглядаюцца спосабы немарфемнага скарачэння (с. 16, 45), імпазіцыі (с. 18–19), устаўкі афікса ва ўтваральныя асновы і выкарыстання афіксаў у якасці самастойных слоў (с. 19) і інш.

У дапаможніку раскрываецца сэнс паняцця «словаўтваральнае значэнне», падкрэсліваецца яго адметнасць у параўнанні з лексічным і граматычным значэннямі, даецца тлумачэнне такіх асноўных комплексных адзінак дэрывацыйнай сістэмы, як «словаўтваральны ланцужок», «словаўтваральная парадыгма», «словаўтваральнае гняздо», «словаўтваральны тып», акрэсліваецца асаблівасць будовы названых з’яў; адзначаецца, што ў словаўтваральным ланцужку «новае слова набывае больш складаную марфемную і адпаведна семантычную структуру. Чым далей знаходзіцца ўтворанае слова ў СЛ ад вяршыні, тым больш складанай з’яўляецца яго словаўтваральная структура:

*стар(ы) – стар-э(ць) – па-стар-э(ць) – па-стар-э-л(ы)*» (с. 26).

Самай складанай комплекснай адзінкай словаўтваральнай сістэмы, як падкрэслівае аўтар, з’яўляецца словаўтваральнае гняздо, якое «ўяўляе сабой сукупнасць аднакаранёвых слоў, звязаных адносінамі вытворнасці. Інакш кажучы, СГ – гэта сістэмнае аб’яднанне словаўтваральных парадыгмаў (па вертыкалі) і словаўтваральных ланцужкоў (па гарызанталі), пры якім розныя словаўтваральныя парадыгмы аднаго гнязда звязваюцца з зыходным словам (вяршыняй гнязда) пры дапамозе словаўтваральных ланцужкоў.

Вяршыня СГ – гэта невытворнае з пункту гледжання сучасных адносін слова, да якога ўзыходзяць усе астатнія ўтвораныя словы гнязда» (с. 27).

Тлумачэнне паняццяў суправаджаецца яркімі, запамінальнымі прыкладамі.

Значная частка дапаможніка прысвечана словаўтварэнню ў межах такіх часцін мовы, як назоўнік, прыметнік, дзеяслоў і прыслоўе. Аналіз дэрывацыйных працэсаў суправаджаецца тлумачэннем словаўтваральнага значэння, якое набываюць утвораныя словы. Напрыклад, розныя суфіксы надаюць назоўнікам значэнне асоб – носьбітаў прадметнай прыметы, асоб – носьбітаў працэсуальнай прыметы, асоб – носьбітаў непрацэсуальнай прыметы, асоб паводле месца жыхарства, асоб (істот) процілеглага полу (паводле жаночасці), асоб са значэннем памяншальнасці, асоб са значэннем павелічальнасці, жывых істот – носьбітаў працэсуальнай прыметы, жывых істот – носьбітаў непрацэсуальнай прыметы і інш.

Форма падачы матэрыялу (пераважна ў табліцах) робіць тлумачэнне даступным, запамінальным.

Акрамя навучальнай і развіваючай функцыі, дапаможнік мае вялікі выхаваўчы патэнцыял: у якасці ілюстрацыйнага матэрыялу выкарыстоўваюцца сказы з павучальным, філасофскім зместам, напрыклад: *«Той дзень зусім закрэслены табою, калі ты раўнадушна абмінуў бяду чужую, пабаяўся болю, абразу хама моўчкі праглынуў…»* (П. Панчанка); «*Рабіць штосьці добрае таму, хто ўжо ніколі табе не падзякуе, – гэта і сумна, і радасна неяк па-асабліваму*» (Я. Брыль); высокамастацкія ўрыўкі з рамана Н. Гілевіча «Родныя дзеці», з верша М. Дуксы «Ранішняя малітва», Р. Барадуліна «Андрэю Вазнясенскаму», вершаказ А. Разанава «Звон» і інш.

Рэцэнзент
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры беларускай мовы*
*Н. І. Новік-Шчарбенка*

МГПУ им. И.П.Шамякина